**ШКОЛЬНАЯ АЛІМПІЯДА ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**V** клас

| Заданні | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 8 | 4 | 6 | 8 | 5 | 3 | 3 | 4 | 4 | 50 |
| | | | | | | | | | | | |

Старшыня журы

Члены журы:

**Заданне 1.** Уякімпарадкутрэбазапісаць сказы, кабатрымаўсятэкст? Выберыце і падкрэсліцеадпаведнырадок з прапанаваных.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 5)*

1) Усе як адзінрослыя, дужыя. 2) Жураўлі то кланяюццаадзінаднаму, то распускаюцькрылы, то ходзяцьупрысядкі, то бегаюцьнавыперадкі. 3) І бадай, найлепшыя танцоры ў птушынымсвеце. 4) Жураўлі, ціжуравы, як яшчэіхназываюць, надзвычайпрыгожыяптахі. 5) Прыляцяць на ціхуюбалацявіну, збяруцца ў карагод і пускаюцца ў скокі. 6) Птушыныцырк, дыйгодзе! 7) Аколькі ў тыхскокахвесялосці! *(ПаводлеУладзіміраЯгоўдзіка)*

**А**. 6, 7, 5, 1, 2, 3, 4
**Б**. 4, 6, 1, 5, 2, 3, 7
**В**. 4, 1, 3, 5, 7, 2, 6
**Г**. 4, 1, 3, 2, 5, 7, 6

**Заданне 2.** Расшыфруйцепрыказку, запісануюлічбамі. Дапаможа вам у гэтымдобраеведаннеалфавіта. Ключ для разгадкішукайце ў слове*абвал*(1, 2, 3, 1, 13). Прыказкузапішыце.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 8)*

26, 1, 13, 1, 3, 6, 12 2, 6, 9 17, 18, 1, 25, 28, 27, 20, 16
17, 20, 21, 27, 12, 1 2, 6, 9 12, 18, 28, 13, 1, 22

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Заданне 3.** Знайдзіцелішняе слова ў кожным радку і падкрэсліцеяго. Усе лішніясловызапішыце па парадку, і ў вас атрымаеццатэкст.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 4)*

У словах трэцігукмяккі: *вавёрка, рысь, воўк, мядзведзь*.

У словах трызычныягукі: *дзік, зубр, вожык, тхор*.

Падкрэсленыягалосныяабазначаюцьцвёрдасцьпапярэдніхзычных: *хуткія, рэдкія, л**я**сныя, с**а**праўдныя.*

У словах гук [п] цвёрды: *птушкі, кіпці, драпежнікі, пацукі.*

**Адказ:** _______________ , _______________ – _______________

_____________________ .

**Заданне 4.** Запішыце да прыведзеных слоў такія аднакаранёвыя, каб націскны склад стаў першым пераднаціскным.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 6)*

Зе́лень – ___________________________________________________________

Ле́кар – ____________________________________________________________

Зве́р – _____________________________________________________________

Све́тлы – ___________________________________________________________

Цё́мны – ___________________________________________________________

Мё́д – _________________________________________________________

**Заданне 5.** З дадзеных словазлучэнняў выберыце неабходныя і размяркуйце па схемах.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 8;*
*-1 б. за няправільнавыпісанаесловазлучэнне)*

Ключ ад дзвярэй, разглядацьмалюнак, чарадзейнаяказка, нахіліцца над братам, смуглы ад загару, спаткацца каля крамы, вядровады, працаваць з натхненнем, да бацькоўскагапарога, гуляць у парку, клён падакном.

1) дзеяслоў + назоўнік у творным склоне: ____________________________

____________________________________________________________________

2) прыметнік + назоўніку родным склоне: ___________________________

____________________________________________________________________

3) назоўнік + назоўніку родным склоне: _____________________________

____________________________________________________________________

**Заданне 6.** Адзначцеправільныяварыянтыперакладуслоў з рускаймовы на беларускую.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 5)*

1) суніцы – земляника,

2) журавіны–малина,

3) ажыны – ежевика,

4) чарніцы – черника,

5) агрэст – крыжовник,

6) парэчкі – смородина.

А. 1, 3, 4, 5 Б. 1, 3, 4, 5, 6 В. 3, 4, 5, 6 Г. 3, 4, 6

**Заданне 7.** Адзначце радкі, у якіх ужываюцца сінонімы.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 3)*

1) паелі – падсілкаваліся;

2) паелі – папілі;

3) дбайны – клапатлівы;

4) дбайны – вясёлы;

5) вясёлы – радасны.

А. 1, 3, 5 Б. 1, 4, 5 В. 1, 5

**Заданне 8.** Сюжэт кожнай казкі выяўляе пэўную кампазіцыйную паслядоўнасць. Выберыце правільны варыянт.

*(Максімальная колькасць балаў – 3)*

1) зачын, кульмінацыя, развязка, канцоўка, завязка.
2) кульмінацыя, развязка, зачын, завязка, канцоўка.
3) завязка, зачын, развязка, кульмінацыя, канцоўка.
4) зачын, завязка, кульмінацыя, развязка, канцоўка.
5) зачын, завязка, канцоўка, кульмінацыя, развязка.

А. 1 Б. 2 В. 3 Г. 4 Д. 5

**Заданне 9.** Устанавіцеадпаведнасцьпаміжпачаткамтвора і ягоназвай.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 4)*

| Пачатактвора | Назватвора |
|---|---|
| **А.** “Жыўадзін бедны чалавек з жонкаю. Нарадзілася ў іх дачка. Прыйшлосяспраўляцьрадзіны. А ў чалавекатагоні хлеба, ні да хлеба. Чымгасцейчаставаць?” | **1.** “Бацькаўшчына” |
| **Б.** “У любімаймове, роднай, наскай, ах, якіясловы…” | **2.** “Мова” |
| **В.** “Жылі-быліасёл, сабака, кот і певень. Каліяныпастарэлі, гаспадарыпавыганяліх з двароў. Неяк раз уночысышліся ў лесе гэтыябяздомныя…” | **3.** “Музыкі” |
| **Г.** “Чую тваюжаўруковую музыку ў скошаныхтравахмурожных…” | **4.**“Разумная дачка” |
| | **5.** “Калі ласка!” |

**А)** А5 Б2 В4 Г3**Б)** А4 Б5 В3 Г1 **В)** А4 Б5 В3 Г2 **Г)** А3 Б2 В4 Г5

**Заданне 10. З**апішыценазву месяца, праякіідзегаворка ў кожным з тэкстаў.

*(Максімальнаяколькасцьбалаў – 4)*

| Тэкст | Назва месяца |
|---|---|
| Народ называегэты месяц месяцам крывыхдарог. Толькіўчорасвяціласонца, цямнеласцяжынка. Раптамналяцеўкалючывецер, пасыпаў снег. Вецерпадхоплівае снег і кружыцьяго. Да вечаранічога не застаецца ад дарогі. | |

| | |
|---|---|
| Дарогупракладаюцьзноў. І так да наступнага снегу, якіяшчэ не раз схаваедарогу ў гэтызімовы месяц з самымікароткіміднямі. | |
| Жыта ў полізашасцела,<br>Ніхмурынкі ў сіняве,<br>Сённявёскаапусцела,<br>Сённякожны на жніве. | |
| Усёбольшадчуваеццавосень. Хуткапачнуццазамаразкі.<br>Ціха і сумна ў лесе. Хібатолькікрыкне сойка дызастукаедзяцел.<br>Заканчваеццалінька пушных звяроў.<br>Адлятаюць у вырайгракі, шпакі, дразды.<br>Дністановяццакарацейшымі і халаднейшымі.<br>Грыбніківедаюць, што свае зімовыя запасы можнапапоўніцьрадоўкамі, зялёнкамі і падзялёнкамі. | |
| Абляцеліжалуды,<br>Дапякаюцьхалады.<br>Пад нагой лісцёшуршыць.<br>А навокал – нідушы. | |

# ДАВЕДКІ

**Прывыкананнізаданняў за кожнуюдапушчануюпамылкуздымаецца 0,2 бала.**

**Заданне 1**

В. 4, 1, 3, 5, 7, 2, 6

**Заданне 2**

Чалавек без працы, штоптушка без крылаў.

**Заданне 3**

Воўк, дзік – лясныядрапежнікі.

**Заданне 4**

Зелень – зялёны.
Лекар – лячыць.
Звер – звярыны.
Светлы – святлець.
Цёмны – цямнець.
Мёд – мядовы.

**Заданне 5**

1) дзеяслоў + назоўнік у творным склоне: нахіліцца над братам, працаваць з натхненнем;
2) прыметнік + назоўнік у родным склоне: смуглы ад загару, да бацькоўскагапарога;
3) назоўнік + назоўніку родным склоне: ключ ад дзвярэй, вядровады.

**Заданне 6**

Б. 1, 3, 4, 5, 6

**Заданне 7**

А. 1, 3, 5

**Заданне 8**

Г. 4

**Заданне 9**

**В) А4 Б5 В3 Г2**

**Заданне 10**

снежань, жнівень, кастрычнік, лістапад